Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 САКАВІКА 2018 г. СЕРАДА № 59 (28675)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**«Бескантактны» заапарк. Ці ёсць у яго будучыня?**

СТАР. 6



**Смартфон – у дапамогу хворым на туберкулёз**

СТАР. 16



**Куды можа пайсці працаваць тытулаваная спартсменка?**

СТАР. 18

# Веснавы штурм неба



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сталічныя аматары паветранага плавання ў ваколіцах Заслаўя спрабуюць падняцца ў веснавое неба.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валерый МАЛАШКА, міністр аховы здароўя:**

*«Электронная ахова здароўя — гэта шлях, які дазваляе павысіць якасць і даступнасць медыцынскай дапамогі насельніцтву. Ён дае магчымасць змяніць падыходы да мадэлі ўзаемадзеяння «ўрач — пацыент». Грамадзянін становіцца актыўным удзельнікам працэсу захавання свайго здароўя. Укараненне лічбавых тэхналогій у медыцыну — гэта своеасаблівая рэвалюцыя і для медыкаў, і для пацыентаў. Да ямо трэба не толькі рыхтавацца тэхнічна, але і рыхтаваць грамадства ў цэлым».*

ISSN 1990 - 763X

## ПАРАДАК БЕЗ УРОНУ

### По краіне адбылося ўжо больш за сто ўзгаранняў у экасістэмах

**Цёплыя веснавыя дні — гэта час, калі на падворках пачынаецца масавае навядзенне парадку. Апалае лісце, галінкі і іншае смецце, якое, як на фотастужцы, праявілася пасля таго, як снег растаў, трэба некуды падзець. І многія для гэтага абіраюць, здавалася б, самы лёгкі па суаднясенні часу і высілкаў варыянт — усё спаліць. Але ратавальнікі папярэджваюць: такі спосаб вельмі небяспечны. Калі, канешне, не прытрымлівацца патрэбных правілаў. Але што за яны? Пра гэта — у гутарцы з афіцыйным прадстаўніком Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталем НАВІЦКІМ.**

Летась падпальванне травы забрала два чалавечыя жыцці. Цікава, што абодва смяротныя выпадкі адбыліся на Магілёўшчыне. 25 красавіка ў Чавускі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях паступіла паведамленне, што каля вёскі Галузы гарыць сухая расліннасць. Тады ў агні загінуў 45-гадовы мясцовы жыхар. Увечары 5 мая ў полі каля вёскі Касмынічы Мсціслаўскага раёна знайшлі абгарэлае цела мужчыны. А вось у Гродне і на Дубровеншчыне па адным чалавеку атрымалі істотныя апёкі — 20 і 36 % цела адпаведна.

СТАР. 4

■ Сітуацыя

## Лебядзіныя «налёты» на рапсавыя пасевы

**Наша газета не раз звярталася да тэмы зубрыных патраваў. Прыпушчанскія сельгаспрадпрыемствы многія гады церпяць ад зубрыных статкаў, якія перыядычна прыходзяць на палі і знішчаюць пасевы розных культур. Жывёлам жа не растлумачыш, што палі засявалі не для іх. Цяпер сельгаспрадпрыемствы часта ўключаюць патравы ў страхавыя рызыкі.**



Не так даўно клопаты земляробам пачалі ствараць лебедзі. Кажуць, што такім паводзінам нашы белыя птахі навучыліся ў сваіх еўрапейскіх суродзічаў. Тыя ўжо даўно перасталі лётаць у выраі, вось і нашы прызвычаіліся зімаваць дома. А вясной, як толькі сыходзіць снег, птушкі чародамі выходзяць на рапсавыя пасевы, каб пачаставацца першымі зялёнымі лісточкамі. Расткі рапсу багатыя на бялок, гэты рацыён ідэальны для сілкавання птушынага арганізма. А для расліны адшчыкванне першых пабегаў азначае пагібель. Для гаспадаркі — прамыя страты.

Другі год на сваіх палях назіраюць лебядзіныя набегі земляробы селекцыйна-гібрыднага цэнтра «Заходні» Брэсцкага раёна. Паводле слоў **начальніка цэха раслінаводства сельгаспрадпрыемства Андрэя КАШЫРЦА,** выдзелены работнік, які будзе ажыццяўляць функцыю вартаўніка палёў. У яго арсенале кійкі ды петарды, каб пужаць птушак і зганяць іх з палёў. Але ж згоніш іх у адным месцы — крылатыя аматары вітаміннага зяленіва пераляцяць у другое...

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЭКЗАМЕН НА БЯСПЕКУ

**Месцы масавага збору людзей будуць правярацца Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях разам з Міністэрствам унутраных спраў. Такая задача была пастаўлена ўчора на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з міністрам унутраных спраў Ігарам Шуневічам.**

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся дзейнасцю міліцыі, але асаблівую ўвагу звярнуў на сітуацыю з бяспекай пасля трагічных падзей у расійскім Кемераве. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што правяраць трэба не толькі гандлёвыя цэнтры: задача ставілася шырэйшая — паглядзець і кінатэатры, і іншыя месцы масавага збору людзей. «Чаму мяне гэта хвалюе? — гаворыць Аляксандр Лукашэнка. — Таму што мы летась далі вялікую свабоду прадпрымальніцтву. Калі ласка, тварыце, рабіце, прыносьце карысць дзяржаве. Папярэдзілі і на ўзроўні законаў, што адказваць будуць галавой, прабачэння не будзе ні за выбухі, ні за пажары. Не дай бог людзі загінуць». Але што ўзяць з бізнесмена, калі ўжо загінулі дзясяткі людзей...

Звяртаючыся да Ігара Шуневіча, Прэзідэнт падкрэсліў: «У мяне просьба і даручэнне вам: жорстка караць, калі толькі вы ўбачыце дзесьці якія-небудзь недапрацоўкі, якія могуць выклікаць цяжкія наступствы, асабліва для людзей і, недапушчальна, для дзяцей».

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўвагі патрабуюць і жылыя дамы. «Праверце, каб потым нам усім не было балюча, калі штосьці, не дай бог, здарыцца», — даручыў Прэзідэнт. Вядома, праца гэта бесперынная, але пэўную «карціну» па краіне неабходна мець да 1 красавіка.

Да тэмы бяспекі Аляксандр Лукашэнка згадаў і мерапрыемствы на гэтых выхадных. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што «мы павінны гарантаваць бяспеку людзей, таму любыя несанкцыянаваныя акцыі, якія перашкаджаюць жыць людзям, павінны перарывацца імгненна».

Паколькі Ігар Шуневіч узначальвае наглядальны савет хакейнага клуба «Дынама-Мінск», то Прэзідэнт пацікавіўся спартыўнымі вынікамі, адзначыўшы, што нельга правальваць міжсезонны перыяд падрыхтоўкі.

Пасля сустрэчы міністр унутраных спраў паведаміў прадстаўнікам СМІ, што былі далажаны таксама вынікі аператыўна-службовай дзейнасці МУС за перыяд з пачатку гэтага года. Канстатуецца нязначнае зніжэнне колькасці злачынстваў (на 3 %). У прыватнасці, не дапушчаны рост асабліва цяжкіх і цяжкіх злачынстваў. Асноўная задача, як падкрэсліў міністр, — падтрымліваць узровень бяспекі і ўмацоўваць яго па некаторых пазіцыях.

Након праверкі месцаў масавага збору людзей Ігар Шуневіч адзначыў, што пры ўсёй лібералізацыі камерцыі нельга забываць пра бяспеку. Пры правядзенні праверак будзе ўлічаны папярэдні вопыт працы ў гэтым напрамку.

Што датычыцца спорту, Прэзідэнту было далажана аб перспектывах хакейнага клуба «Дынама-Мінск». Кіраўнік наглядальнага савета прапанаваў захаваць трэнерскі штаб на наступны сезон. Пэўнай станоўчай дынамікі дасягнулі, таму неабходна даць шанц для развіцця. Пры гэтым Ігар Шуневіч упэўнены, што колькасць легіянераў паступова трэба скарачаць. Стымуляцыя айчыннага хакея магчымая, толькі калі робіцца стаўка на сваіх трэнераў і гульцоў.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# ПАДАТКІ І ЛІЧБАВІЗАЦЫЯ

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Савета па развіцці прадпрымальніцтва, кіраўніком Апарату Савета Міністраў Аляксандрам Турчыным. Асноўнымі тэмамі для абмеркавання сталі дзейнасць Савета, рэформа Падатковага кодэкса і магчымасці стварэння Міністэрства лічбавай эканомікі.**

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як увогуле ідуць справы ў прадпрымальніцкім асяроддзі. За час, які прайшоў з 10 кастрычніка мінулага года — даты прыняцця Указа Прэзідэнта «Аб Савеце па развіцці прадпрымальніцтва», — Саветам падрыхтаваны заключэнні па праектах больш як 30 указаў, 10 законаў і 46 пастаноў Савета Міністраў. Акрамя таго, у ім разгледзелі больш за 40 зваротаў па розных праблемах: пачынаючы ад просьбаў аб дапамозе ў выдзяленні фінансавай падтрымкі да скаргаў на дзеянні арэндадаўцаў і мясцовых органаў улады.

Након Падатковага кодэкса кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта пытанне нумар адзін: «У нас павінна быць падатковая сістэма сапраўды няцяжкай. Але дзяржава павінна функцыянаваць. І другое — што абсалютна правільна і дакладна, нас крытыкуюць часам за гэта, — нам патрэбны Падатковы кодэкс зручны, просты, каб людзі разумелі яго. Але, рэфармуючы яго, каб мы ні ў той, ні ў іншы бок крэн не зрабілі. Гэта значыць не зрабілі нашу падатковую сістэму празмернай, каб яна не ціснула на прадпрымальніцтва. І, з другога боку, каб мы — што яшчэ небяспечней — не агалілі дзяржаву. Нельга агаліць асноўныя напрамкі дзейнасці дзяржавы».

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся меркаваннем старшыні Савета па развіцці прадпрымальніцтва наконт Міністэрства лічбавай эканомікі. Магчыма, гэта будзе новая структура. А можа, варта правесці рэформу і аб'яднаць міністэрствы, якія ў перспектыве будуць працаваць на «лічбу», спытаў Прэзідэнт.

Пасля сустрэчы ў кіраўніка дзяржавы Аляксандр Турчын падвёў для журналістаў вынікі размовы. Ён адзначыў, што Аляксандр Лукашэнка падтрымаў ідэю, каб у грамадска-кансультацыйных саветах пры міністэрствах актыўней прыцягваць бізнесменаў да абмеркавання праектаў нарматыўна-прававых актаў, якія распрацоўваюцца. Акрамя таго, гаворка ішла пра стварэнне саветаў па развіцці прадпрымальніцтва ў абласцях і раёнах. Гэта дапаможа вырашаць праблемныя пытанні бізнесу, звязаныя, напрыклад, з арэндай і зямельнымі адносінамі — тым, што знаходзіцца ў кампетэнцыі мясцовых улад.

Аляксандр Турчын нагадаў, што ва ўрадзе створана рабочая група пад старшынствам першага віцэ-прэм'ера, якая займаецца рэформай Падатковага кодэкса. Унесці на разгляд новую рэдакцыю плануецца сёлета да 1 верасня. Таксама ён адзначыў, што тэма стварэння Міністэрства лічбавай эканомікі стане асноўнай на найбліжэйшым пасяджэнні ў пашыраным складзе савета па лічбавай эканоміцы, які ўзначальвае прэм'ер-міністр. Мяркуецца, што яно адбудзецца ў красавіку. А само міністэрства можа быць створана да канца гэтага года.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У РАСІІ АБВЕШЧАНЫ ДЗЕНЬ ЖАЛОБЫ



Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін абвясціў 28 сакавіка ў Расіі днём жалобы па загінулых пры пажары ў кемераўскім гандлёвым цэнтры «Зімовая вішня».

Пра гэта паведамляе прэс-служба Крамля. Па ўсёй краіне будуць прыспушчаны дзяржаўныя сцягі, установам культуры і тэлеканалам рэкамендавана адмяніць забаўляльныя мерапрыемствы і перадачы. Пры пажары загінула 41 дзіця, перадае «Інтэрфакс». Усяго ахвярамі пажару сталі 64 чалавекі. Следчы камітэт Расійскай Федэрацыі завёў справу па трох артыкулах, затрыманы некалькі чалавек.

Па даных следства, у ГЦ не працавала пажарная сігналізацыя, а ахоўнік, які дзяжурыў у дзень здарэння, не ўключыў сістэму апавяшчэння. Найбольш імаверная прычына ўзгарання ў гандлёвым цэнтры ў Кемераве звязаная з замыканнем электраправодкі. Пра гэта паведаміў кіраўнік Следчага камітэта Аляксандр Бастрыкін, перадае «Інтэрфакс».

Уладзімір Пуцін падчас нарады ў Кемераве, прысвечаной ліквідацыі наступстваў пажару ў ГЦ «Зімовая вішня», назваў у ліку прычын таго, што здарылася, злачынную халатнасць і разгільдзяйства, перадае РІА «Навіны».

## РАЗВЕДКА ПАЎДНЁВАЙ КАРЭІ ПАЦВЕРДЗІЛА ВІЗІТ КІМ ЧЭН ЫНА Ў КІТАЙ

Разведка Паўднёвай Карэі пацвярджае, што лідар КНДР Кім Чэн Ын сапраўды здзейсніў 26—27 сакавіка візіт у Кітай, прыбыўшы ў Пекін спеццягнікам, паведамляе паўднёвакарэйская газета «Часон ільбо». «Кітай сапраўды наведаў Кім Чэн Ын», — піша газета, спасылаючыся на высокапастаўленую крыніцу ў разведорганах.

Раней яшчэ адна паўднёвакарэйская газета «Ханкёрэ сімбун» на сваім сайце таксама сцвярджала, што ёй удалося ўстанавіць, што на спеццягніку Кітай наведаў лідар КНДР. «Ханкёрэ сімбун» таксама паведаміла, што 26 сакавіка Кім Чэн Ын у Пекіне сустрэўся з найвышэйшымі дзеячамі Кампартыі Кітая, у тым ліку са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам. Разам з тым урад Паўднёвай Карэі, высвятляючы сітуацыю, афіцыйна пакуль не пацвярджае гэтых звестак.



## ВУЛКАН ЭТНА СПАЎЗАЕ ДА МІЖЗЕМНАГА МОРА

Самы актыўны вулкан у Еўропе Этна спаўзае ў бок Міжземнага мора з хуткасцю каля 14 міліметраў у год, высветлілі навукоўцы. «Пакуль няма прычын для трывогі, аднак назіраць неабходна», — расказаў BBC адзін з аўтараў даследавання, геолаг Брытанскага адкрытага ўніверсітэта Джон Мюрэй, які правёў амаль паўстагоддзя, вывучаючы галоўны еўрапейскі вулкан. За гэты час ён размясціў сетку высокадакладных GPS-станцый вакол гары, каб сачыць за яе паводзінамі.

Гэтая апаратура адчувальная да міліметровых змен формы вулканічнага конуса.

# І культура, і эканоміка

## Прэзідэнты Беларусі і Украіны правялі тэлефонную размову

**Яны абмеркавалі падрыхтоўку да першага форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны, які адбудзецца ў кастрычніку ў Гомелі. Яшчэ адной тэмай тэлефоннай размовы лідараў дзяржаў сталі Дні культуры Украіны, правесці якія запланавана ў Беларусі з 7 па 20 ліпеня. Пра гэта паведамляецца на афіцыйным інтэрнэт-партале Прэзідэнта Беларусі.**

Дні культуры Украіны прыпадуць на дзве значныя падзеі ў культурным жыцці Беларусі — свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») і міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». У праграмы абодвух свят будуць уключаны выступленні і канцэрты ўкраінскіх артыстаў.

Акрамя таго, размова паміж прэзідэнтамі ішла аб развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і ўзаемадзеянні ў розных галінах. У тым ліку разгледжаны ход рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых на найвышэйшым узроўні падчас узаемных візітаў лідараў двух краін, якія адбыліся раней.

# ПАДЗЯЛІЛІСЯ НАБАЛЕЛЫМ

**Гэтай магчымасцю падчас тэлефоннай лініі са старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Уладзімірам ДАМАНЕЎСКІМ скарысталіся 22 чалавекі.**



Фота БЕЛТА.

Больш за ўсё прагучала званкоў з Магілёва. Жыхарка з вуліцы Першамайскай была заклапочана няякасным, на яе погляд, рамонтам паддашкавага перакрыцця ў яе доме. Жанчыне паабяцалі пракантраляваць тэхналагічны працэс. Губернатар параіў адказным за рамонт прасачыць, каб работы былі скончаны не пазней за красавік.

Прагучала некалькі пытанняў наконт кошту арэнднай платы і жыллёва-камунальных паслуг у інтэрнатах Магілёва і праблем з будаўніцтвам прыватнага жылля. Пенсіянерка з вуліцы Крупскай паскардзілася на занадта шумных суседзяў і міліцыянераў, якія, на яе думку, перавысілі свае паўнамоцтвы. Губернатар загадаў спецыялістам вывучыць канфліктную сітуацыю, а кіраўніцтву праваахоўных органаў параіў правесці работу, асабліва з маладымі супрацоўнікамі, на тэму карэктнасці паводзін з насельніцтвам. Дапамога спатрэбілася яшчэ адной магіляўчанцы, якая з-за слупа высакавольтнай лініі перадачы не можа ўзаконіць свой участак. Слуп не працуе, але ніхто не спяшаецца яго прыбраць. Уладзімір Даманеўскі даў даручэнне разабрацца ў сітуацыі. Заблытаная гісторыя з кітайскім дамафонам, які працуе толькі пры наяўнасці стацыянарнага тэлефона, прагучала ад жыхаркі адной з магілёўскіх «высотак». Запорна-перагаворнае абсталяванне наогул не абслугоўваецца, бо ў абласным цэнтры не знайшлося фірмы, якая працавала б з такімі сістэмамі. Яшчэ адна магіляўчанка палічыла неабходным паведаміць пра тое, што адзін з вытворцаў мяса птушкі з Магілёўскага раёна вельмі напампоўвае яго вадой. Упраўленне гандлю аблвыканкама атрымала даручэнне ўнікнуць у тэму і разабрацца. Пенсіянерка з Магілёва пажадала даведацца, чаму не ацяпляецца ранішні дызель Магілёў — Жлобін. Жанчына кажа, што захварэла за кошт гэтай эканоміі. Спачатку яна спрабавала высветліць прычыну непаследа ў чыгуначнікаў, але праблему вырашыць не атрымалася.

Жыхарка Хоцімска паскардзілася на непаразуменне з раённай службай сацыяльнай абароны з-за інваліднага крэсла для маці. Зараз гэта пытанне знаходзіцца на разглядзе ў Камітэце па працы і сацыяльным абслугоўванні Магілёўскага аблвыканкама. Уладзімір Даманеўскі параіў кіраўніцтву раёнаў, якія мяжуюць з Расіяй, быць асабліва ўважлівымі да насельніцтва, ствараць умовы не горшыя, чым у суседзяў, каб не ўзнікала жадання працаваць на эканоміку іншай краіны.

Невырашальнае пытанне наконт бацькоўскай спадчыны ў Бабруйскім раёне стала нагодай для звароту на прамую лінію да кіраўніка абласной вертыкалі ўлады сталічнай жыхаркі. Частка дома належыць сельсавету, веранда там згарэла, дах абваліўся. Жанчына гатова купіць яе за разумную цану, але юрыдычныя складанасці не даюць справе зрушыцца з мёртвага пункта. Губернатар крытычна заўважыў, што цяганіна з пытаннем — гэта нежаданне мясцовых службаў браць на сябе адказнасць. Ён даручыў абласным спецыялістам канчаткова разабрацца з пытаннем.

Падагульняючы вынікі прамой тэлефоннай лініі, губернатар адзначыў, што гарачых і складаных пытанняў у зваротах не прагучала.

— Трэба весці больш актыўную тлумачальную работу з насельніцтвам, — адзначыў ён. — Часцей сустракацца з людзьмі і расказваць, як вырашаюцца тыя ці іншыя жыццёвыя сітуацыі. І дэпутатам таксама трэба да гэтага далучацца. Мы павінны працаваць на апярэджанне. Ідзе вясна, і хутка пачнуцца работы па рамонце асфальтавага пакрыцця. І гэта тэма зноў стане актуальнай для тэлефонных ліній. Трэба ўжо сёння тлумачыць грамадзянам, якія стаяць перад намі задачы і як яны будуць рэалізоўвацца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Дзяржава і бізнес

# АДЗІНЫ ПАДАТКОВЫ... БАР'ЕР?

**«Лібералізаваны» бізнес можа атрымаць новую падатковую нагрузку. Міністэрства фінансаў парэкамендавала падняць стаўку адзінага падатку для малога прадпрымальніцтва на 7,4 %. У інспекцыі МПЗ па Мінску абгрунтавалі гэта вынікамі нядаўняй праверкі даходаў плацельшчыкаў адзінага падатку ў розничным гандлі для насельніцтва за мінулыя два гады. Па іх замеры выручка некаторых прадпрымальнікаў вырасла ад 25 % да 55 % у параўнанні з 2016 годам. Канчатковае рашэнне аб магчымым павышэнні адбудзецца толькі пасля грамадскіх абмеркаванняў. Але ўжо сёння вядома, што Мінск і некаторыя абласныя цэнтры падтрымліваюць ініцыятыву. Пазіцыя бізнесу па гэтым пытанні застаецца, мякка кажучы, неадназначнай.**

### Мінск будзе прытрымлівацца рэкамендацый

Сёння адзіны падатак выплачваюць індывідуальныя прадпрымальнікі і фізічныя асобы, якія займаюцца некаторымі відамі прадпрымальніцкай дзейнасці. Зараз складана сказаць, што стаўка адзінага падатку вырасце ва ўсіх абласцях краіны. Эксперты і парламентарыі працягваюць працаваць над новай рэдакцыяй Падатковага кодэкса.

Аднак вядома, што ў Мінску ўжо разлічваюць дадаткова атрымаць ад павышэння стаўкі 1,8 мільёна рублёў. У горадзе збіраюцца прытрымлівацца рэкамендацый Мінфіна.

Такім чынам, у сталіцы рэпетытарам прыйдзецца плаціць на два рублі больш або 36 рублёў. Таксістам — да 171 рубля ў месяц, самазанятым праграмістам — да 124 рублёў (+8 рублёў). Прадпрымальнікі, якія займаюцца рамонтам і тэхабслугоўваннем машын, заплацяць 215 рублёў (+14 рублёў).

### У Віцебскай вобласці могуць павысіць

Але гэта пакуль недакладна. Чакаецца, што індэксацыя ставак адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб дазволіць дадаткова прыцягнуць у 2018 годзе ў мясцовы бюджэт 0,6 мільёна рублёў.

Таксісты з аўто, якое разлічана на шэсць пасажыраў, заплацяць 182 рублі. Калі салон большы — 218 рублёў. Прадаўцы аўто з новай стаўкай будуць плаціць да 417 рублёў.

Беларусы, чый бізнес не патрабуе рэгістрацыі, таксама будуць плаціць больш. Напрыклад, самазанятыя фатографы — 126 рублёў, распрацоўшчыкі сайтаў — 97 рублёў.

### А што ў Гомелі?

Там аблвыканкам ужо прапанаваў павысіць стаўку адзінага падатку па рэкамендацыі. Аднак ёсць і адрозненні: у асобныя графы вынесеныя стаўкі для Гомеля, Мазыра, Рэчыцы, Светлагорска, Жлобіна. Напрыклад, вядома, што прадаўцы аўто ў Гомелі будуць плаціць адзіны падатак у памеры 363 рублі, а ў іншых населеных пунктах — 245 рублёў. Салоны прыгажосці, якія не наймаюць персанал, у Гомелі заплацяць 97 рублёў, у Мазыры, Жлобіне, Рэчыцы і Светлагорску — 86 рублёў, а ў астатніх населеных пунктах вобласці — 54 рублі. Гомельскія таксісты з аўто, якое ўмяшчае чатырох пасажыраў, заплацяць 140 рублёў, а ў іншых населеных пунктах 78 рублёў. Праграмісты ў абласным цэнтры будуць плаціць па стаўцы 124 рублі, а ў рэгіёнах — ад 113 рублёў.

### Будуць адстойваць сваю пазіцыю

Магчыма, што падатковыя змены закрануць і астатнія вобласці. Праца над дакументам не завершана. Новая рэдакцыя павінна з'явіцца да 1 верасня гэтага года. Пры гэтым бізнесмены абмяркоўваюць навацыі ў фіскальнай сістэме. Аднак далёка не ўсе падзяляюць жаданне дзяржавы павысіць адзіны падатак. **Сустаршыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Віктар МАРГЕЛАЎ** лічыць, што сітуацыя ў малога бізнесу лепшай за гэты год не стала. «Нягледзячы на ўзровень інфляцыі, які за мінулы год склаў 4,6 %, у Мінску спрабуюць павялічыць стаўку адзінага падатку на 7,4 %. У той жа час адбыўся імклівы рост буйных гандлёвых сетак, а доля і выручка прадпрымальнікаў, якія працуюць у гандлі, — зменшылася. Было б справядліва не павышаць падатак», — адзначыў Віктар Маргелаў.

Пры гэтым ёсць і пэўная катэгорыя прадпрымальнікаў, у якіх выручка вырасла. Для іх, у выпадку, калі ўлады ўсё ж вырашаць падняць падатак, на думку прадстаўніка канфедэрацыі, было б разумна павышаць стаўку адзінага падатку на памер не вышэйшым за ўзровень інфляцыі.

«Калі падатак робяць большым за ўзровень інфляцыі, то гэта пагаршае ўмовы працы для малых прадпрымальнікаў у параўнанні з буйнымі», — дадаў Віктар Маргелаў.

Прадстаўнікі малога і сярэдняга бізнесу працягнуць абмяркоўваць гэтае пытанне і адстойваць сваю пазіцыю.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Будзь у курсе!

# ПУЦЁЎКІ НА ПАЛЯВАННЕ — ПРАЗ СЕЦІВА

**Усіх карыстальнікаў паляўнічых угоддзяў краіны абавязалі забяспечыць продаж пуцёвак праз інтэрнэт да 1 студзеня 2019 года.**

Гэта стала магчымым дзякуючы падпісанаму кіраўніком дзяржавы Указу № 112 «Аб паляванні і вядзенні паляўнічай гаспадаркі». Дакументам прадугледжваецца шэраг мер, скіраваных на ўдасканаленне дзейнасці ў названай сферы. Так, указ спрашчае працэдуру выдзялення ў арэнду паляўнічых угоддзяў. Цяпер юрыдычнай асобе дастаткова падаць заяву і прайсці пэўную працэдуру. Павялічваецца і мінімальны тэрмін арэнды паляўнічых угоддзяў да 20 гадоў — раней было да 10 гадоў.

Сярод іншых навацый тое, што са спіса адміністрацыйных працэдур выключаная акрэдытацыя на права вядзення паляўнічай гаспадаркі. Былі ўлічаны прапановы і Дзяржінспекцыі, і грамадскіх аб'яднанняў, якія лічылі, што гэта залішняя бюракратычная працэдура. Таксама дакументам спрошчана атрыманне ўчасткаў для вальераў. Гэта будзе адбывацца на падставе рашэння мясцовага выканаўчага органа — райвыканкама — і па ўзгадненні з землекарыстальнікамі. Цяпер не трэба працэдуры канфіскацыі зямельнага ўчастка ў апошняга.

Указ прадугледжвае выпадкі, калі паляўнічым пры правядзенні палявання ў прысутнасці службовай асобы — карыстальніка паляўнічых угоддзяў — дазваляецца перавозка разраджанай незачахлёнай зброі (акрамя населеных пунктаў). Яшчэ адно новаўвядзенне дазволіць прысутнічаць на паляванні ў якасці загоншчыкаў асобам, што дасягнулі 18 гадоў, якія не маюць дзяржпасведчання на права палявання.

Змяніўся і час, калі веснавое паляванне забаронена: раней забарона дзейнічала з 11.00 да 18.00, з уступленнем указа ў сілу — з 12.00 да 18.00.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Фота вяртае ў гісторыю

**У музеі гісторыі Магілёва адкрылася выстаўка фотамайстра Ірыны САВОСІНАЙ, прысвечаная 100-гадоваму юбілею «Магілёўскай праўды».**

У журналістыцы Ірына болей за 45 гадоў, 20 з якіх аддала рабоце ў абласной газеце. Назва яе выстаўкі — «Вяртаючыся да надрукаванага». Гэта зварот да тых публікацый, якія ўбачылі свет на старонках выдання.

— Калісьці 100-годдзе «Магілёўскай праўды» здавалася мне вельмі далёкай будучыняй, а нядаўна, калі святкавалі гэты юбілей, узнікла жаданне праілюстраваць падзею. Сімвалічна выбрала 100 фотаздымкаў. Выбар быў жорсткі: фотаздымкі павінны былі быць цалкам натуральнымі, без выкарыстання фоташопа. Таму я выбірала кадры, у якія не трэба было ўмешвацца, — кажа аўтар.

У выставачнай зале музея гісторыі Магілёва быццам матэрыялізаваліся пераломныя 90-я. Канцэрты, святы, наступствы чарнобыльскай трагедыі, гарадскія фотазамалёўкі, пярэстыя рыначныя палаткі першых у гісторыі краіны прадпрымальнікаў — жыццё ва ўсёй сваёй разнастайнасці і існасці... Шмат фота з прызыўнога пункта — у іх столькі эмоцый і пачуццяў, што настрой адчуваецца проста фізічна.



Жудасныя здымкі з комінамі ад згарэлых дамоў у вёсцы Калюга Глускага раёна. У 1992 годзе было вельмі спякотнае лета, вогненная стыхія хваляй пракацілася па вёсцы, пакінуўшы людзей без жытла. Нават здымаць было цяжка і рызыкоўна, успамінае аўтар. Потым вёска адрадзілася, зараз фота — адзіны напамін пра тое страшнае няшчасце.

— 90-я гады былі багатымі на падзеі, — успамінае Ірына. — Прапанаваныя ў гэтым праекце тэмы былі адлюстраваны на старонках «Магілёўскай праўды» і яе дадатку «Дняпроўская нядзеля» адным або некалькімі фотаздымкамі. Зараз ёсць унікальная магчымасць да іх вярнуцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Карысныя тэхналогіі

# QR-КОД ЗАМЕСТ ЧАРНІЛЬНАЙ ПЯЧАТКІ

## Як праверыць свайго партнёра на сумленнасць

**Цяпер гэта можна зрабіць з дапамогай бясплатнай мабільнай праграмы QR-belinfo, якую распрацавала кампанія «СмартФінСофт». Новы сродак дазваляе згенерыраваць персанальны QR-код, праскананаваўшы які можна будзе пабачыць усю інфармацыю пра кампанію: назву, сайт і кантактныя звесткі.**

Восенню мінулага года дэкрэт Прэзідэнта № 7 дазволіў суб'ектам гаспадарання не карыстацца чарнільнай пячаткай, аднак гэта на справе выклікала нямала непаразуменняў паміж контрагентамі, бо любая кампанія мае патрэбу ў ідэнтыфікацыі. Зрабіць сваё распазнаванне мабільным і зручным і прапануе QR-belinfo.

Згенерыраваны персанальны QR-код можна выкарыстоўваць замест пячаткі, наносіць яго на бланкі, візіткі і папяровыя дакументы. Такой «лічбавай пячаткай» можна таксама дзяліцца праз электронную пошту і месенджары. З дапамогай QR-кода або УНП можна ў рэжыме анлайн праверыць контрагента па 16 важных параметрах. У тым ліку даведацца, напрыклад, ці не знаходзіцца ён у спісе прадпрыемстваў з павышаным рызыкай здзяйснення правапарушэнняў у эканоміцы, ці не праходзіць працэдуру банкруцтва ці ліквідацыі. Праверыць інфармацыю пра свайго партнёра можна таксама на інтэрнэт-платформе dolgovnet.by.

**Ірына СІДАРОК**

# «Сяброўства» з кватарантамі лепш узаконіць

**Інспекцыяй Міністэрства па падатках і зборах па гораду Мінску з 26 да 30 сакавіка 2018 года праводзіцца ўжо штогадовая акцыя «Здаеш кватэру — плаці падаткі».**

У сувязі з гэтым прэс-служба міністэрства просіць памятаць законапаслухмяных жыхароў горада аб наступным. Грамадзяне, якія маюць інфармацыю аб нелегальнай здачы ўнаём кватэр у Мінску, могуць паведаміць пра гэта штодня з 9.00 да 18.00 па тэлефоне 229-26-59. Вось так. Хто здае сваё жыллё «ў шэрую», таму дрыжаць і баяцца. А лепш аформіць усё па законе.

**Сяргей ПАЛІНІН.**


**Организатор торгов, антикризисный управляющий ООО «Белкомтехстрой» – ИП Витковская Н. А., действуя на основании Определения Экономического суда города Минска от 24.11.2017 г. по делу № 999-17Б/2015, сообщает о проведении торгов по продаже имущества. Продавец – ООО «Белкомтехстрой». Торги проводятся в форме открытого аукциона**

| № | Наименование объектов торгов | Стоимость единицы (без учета НДС) бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Производственное помещение, расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н., г. Логойск, ул. Заводская, д. 36, пом. 1 (ИНВ. № 601/D-5673) | 327 469 бел. руб. |

До подачи заявления на участие в торгах Претенденту необходимо перечислить задаток в размере 10 % от общей стоимости имущества на расчетный счет не позднее 27.04.2018 г.: ООО «Белкомтехстрой», р/с: № BY30UNBS30120664500060000933 ЗАО «БСБ Банк» г. Минск, БИК UNBSBY2X, УНП 101210699. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется с момента опубликования настоящего объявления и по 27 апреля 2018 года, в рабочие дни, с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 68, к. 801.

Торги состоятся 3 мая 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 68, к. 801.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в объявлении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

– заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в объявлении о проведении торгов;

– для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

– для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

– для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

– для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Победитель торгов возмещает затраты, связанные с организацией и проведением торгов. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней со дня проведения торгов. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются в день проведения торгов. В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Порядок проведения торгов, условия, оформление участия в торгах определяется положением о проведении торгов по продаже имущества ООО «Белкомтехстрой», ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах. С дополнительной информацией о предмете торгов можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 68, к. 801. Тел. (017) 399-89-29»

■ 50+: жыць цікава

# АДРЭНАЛІН МОЖА БЫЦЬ І Ў 94 ГАДЫ!

**«З 40 членаў шахматнага клуба «Гамбіт» 39 — гэта мужчыны, — кажа старшыня клуба 61-гадовая Алена Драздовіч. — Жанчыны таксама сюды зрэдку заляталюць (па-іншаму і не скажаш) — праўда, ненадоўга... Хоць вочы ў іх і гараць: вядома ж, столькі мужыкоў тут збіраецца, ды якіх!.. На жаль, наш клуб не займаецца падрыхтоўкай шахматыстаў: каб трапіць сюды, чалавек павінен ужо ўмець гуляць у шахматы. І мы збіраемся не пагаварыць — а дзеля гульні. Нават тэлефоны свае адключаем на гэты час. Шахматы — гэта сур'ёзная інтэлектуальная праца, і ў нас ствараюцца ўсе ўмовы, каб не збіць гульцоў з думкі...»**

Гэта і насамрэч больш мужчынскі варыянт баўлення часу. Размаўляць пра жыццё няма калі, трэба гуляць! «І ў 90-гадовых яшчэ паспрабуй выйграць!» — усміхаецца Алена Драздовіч.

Ёсць аматары хуткасных шахмат — дзе гульня доўжыцца 15 хвілін. Але асноўная маса сяброў клуба гуляюць па паўгадзіны. З цягам часу з'яўляюцца нейкія сяброўскія сімпатыі, бывае, людзі ўжо выбіраюць больш-менш пастаянных партнёраў для гульні і вельмі сумуюць, калі партнёр не прыйшоў, хоць наогул шахматысты вельмі самадастатковыя людзі.

Наша суразмоўніца прыйшла ў «Гамбіт» адразу пасля таго, як выйшла на заслужаны адпачынак, у 2006 годзе. «Тут я пазнаёмілася з вельмі цікавымі людзьмі, — гаворыць яна. — Для пенсіянера, які не працуе, гэта цудоўны занятак. Мы і дома абдумваем шахматныя задачы — бывае, цэлы тыдзень гэтым заняты. Ды і ў якасці барацьбы з ленасцю мець такое хобі таксама добра: як мінімум два разы на тыдзень трэба ўстаць, апрануцца, прывесці сябе ў парадак, выйсці ў людзі і пастарацца не спазніцца».



81-гадовы гросмайстар Уладзімір СЫЧОЎ, аўтар кнігі «250 выбраных шахматных кампазіцый».

Шахматны клуб «Гамбіт» Палаца культуры ветэранаў працуе два разы на тыдзень — у панядзелак і чацвер. Аматары гэтай інтэлектуальнай гульні прыязджаюць сюды з усяго Мінска і ў любое надвор'е. Самаму маладшаму ўдзельніку клуба 61 год, найстарэйшым — Віктару Марозаву і Васілю Папову — ужо па 94 гады! У асноўным жа клуб наведваюць людзі старэйшыя за 70.

«Як мне казаў калісьці бацька, шахматы — гульня высакародных людзей, — кажа адзіная ў клубе жанчына. — І атмасфера ў нас інтэлігентная. Мяне не крыўдзяць. Зараз нават абралі старшынёй клуба. І са святам 8 Сакавіка мяне многія асабіста павіншавалі, частавалі цукеркамі і шакаладкамі, каб мае мазгі добра працавалі. Хоць я і лічу, што я жанчына кожны дзень, але ўсё роўна было прыемна»...

«Іншым разам у нашым ціхім клубе бываюць такія страсці! — працягвае Алена Драздовіч. — Мы прытрымліваемся правілаў Міжнароднай шахматнай федэрацыі ФІДЭ. Адно з іх, напрыклад, такое: узяўся за фігуру — хадзі. І бывае, чалавек зробіць немагчымы ход альбо ў кагосьці рука мімаволі пацягнулася па фігуру, а потым ён вырашыў яшчэ падумаць — і часцей за ўсё яго партнёр можа дазволіць перахадзіць. Але бываюць моманты, калі пачынаецца спрэчка, асабліва калі партнёры напярэдадні не абгаварылі паміж сабой, ці будуць гуляць строга па нормах ФІДЭ, ці выконваць толькі асноўныя правілы. Канешне, шахматныя фігуры пры гэтым не лятаюць, але эмоцыі кіпяць! А які гэта адрэналін — сачыць за чыёйсьці гульнёй! Разбіваемся на два лагеры і «хварэем»: хто за «белых», хто за «чорных»... А пасля няўдалага рашэння гульца іншы раз можна пачуць: «ну што ж ты?!» — сказанае з такой шчырай скрухай, і столькі эмоцый у гэтым кароткім воклічы!..



94-гадовы афіцэр у адстаўцы Віктар МАРОЗАЎ.

Дарэчы, члены шахматнага клуба «Гамбіт» часта становяцца ініцыятарамі правядзення раённых спаборніцтваў па шахматах па месцы свайго жыхарства (усе ж з розных раёнаў горада). А яшчэ ў «Гамбіта» ёсць мара — правесці сёлета гарадскі турнір па шахматах. І гэта цудоўна: марыць, будаваць планы, старацца іх ажыццявіць... Карацей кажучы — жыць напоўніцу.

**Святлана БУСЬКО**

# ПАРАДАК БЕЗ УРОНУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета сітуацыя склалася даволі неадназначная. Да канца мінулага тыдня вясна, здавалася, «сарвала стоп-кран». Адначасова для краіны актуальна як пытанне паводкі, так і пажараў. Снег сышоў толькі ў Гродзенскай вобласці і часткова ў Мінскай. Статыстыка пажараў у экасістэмах адпаведная. 102 узгаранні зафіксаваны на пачатку тыдня на Гродзеншчыне, яшчэ 17 — на Міншчыне, 4 пажары адзначаны на Брэстчыне. У астатніх абласцях «лічыльнік» трымаецца на нулі. Прынамсі, пакуль ёсць пацярпелыя, агонь паспеў знішчыць дзве гаспадарчыя пабудовы.

— Агулам за мінулы год па краіне ў экасістэмах здарылася каля паўтары тысячы пажараў у вясновы час. І прычына іх, як правіла, простая. Людзі лічаць, што агонь — гэта найбольш эфектыўны спосаб пазбавіцца ад леташняй раслліннасці і смецця. Хоць эколагі даўно даказалі: адзінае, што прыносіць такі метад, — гэта ўрон.

У групе рызыкі — людзі пажылога ўзросту. Гады ўжо не тыя, і захоўваць рухомасць і канцэнтрацыю, як у маладыя гады, становіцца ўсё цяжэй. Агонь жа распаўсюджваецца па зямлі з хуткасцю чалавека, які бяжыць. Трапіць у вогненную пастку пажылому чалавеку вельмі лёгка. Менавіта таму лепш прыехаць да сваіх бабуль і дзядуль і дапамагчы ім навесці парадак на ўчастку больш бяспечнымі метадамі.

— Аднак адназначнай забароны таго, каб спальваць на сваім прысядзібным участку смецце, няма, — працягвае Віталь Навіцкі. — Проста трэба гэта рабіць правільна. Напрыклад, бяспечная адлегласць ад вогнішча да пабудоў складае сама меней 10 метраў. Калі ж вы развялі полымя непадалёк ад лесу, то гэты паказчык павялічваецца як мінімум удвая. А калі непадалёк ад вас месціцца стог саломы, то адступіць ад яго трэба ўжо на тры дзясяткі метраў. Месца, дзе нішчыцца смецце, трэба дбайна акапаць. Агонь наткнецца на натуральны бар'ер і па-за гэтую мяжу не выйдзе. За вогнішчам трэба пастаянна сачыць і ні на хвіліну не пакідаць без увагі. Распальваць яго варта ў бязветранае надвор'е. І заўжды пад рукой трэба мець сродак, якім можна будзе патушыць агонь. Вогнетушыцель з машыны, вядро з вадой або з пяском... Калі ж вы бачыце, што агонь выйшаў з-пад кантролю, то адзінае, што застаецца, — паведаміць ратавальнікам аб тым, што адбылося. Бо самастойна патушыць буйны агонь вы наўрад ці здолееце, а вось урон будзе нанесены істотны. У ранейшыя гады былі выпадкі, калі гарэлі цэлыя дамы, і Следчы камітэт афармляў справу ў суд. Асаблівая праблема — ва ўмовах шчыльнай забудовы, напрыклад, у садовых таварыствах.

**Агонь распаўсюджваецца па зямлі з хуткасцю чалавека, які бяжыць. Трапіць у вогненную пастку пажылому чалавеку вельмі лёгка.**

Часцей за ўсё згараюць менавіта гаспадарчыя пабудовы. Жылыя дамы пабудаваны звычайна з высокім фундаментам. Затрымаць агонь, які сцелецца па зямлі, тээратычна ў стане нават бетонная дарожка. А вось пуні — гэта, як правіла, склад сена або высахлых дроў. Трэскі ж гараць, як порах.

Сярод леташняга лісця могуць трапіцца і пластыкавыя ўпакоўкі. Палімеры небяспечныя тым, што пры гарэнні выдзяляюць цэлы «букет» таксічных рэчываў. Таму атручэнне чадным газам падчас «вогненнай прыборкі» атрымаць цяжка, а вось нанюхацца гарэлага пластыку — вельмі проста. Таму лепш усё-такі спальваць толькі натуральную арганіку — галінкі, лісце дрэў, старую траву.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**



■ Здарэнні

## Падпаліў дом з людзьмі

**У сем гадзін раніцы ратавальнікам паступіла паведамленне аб загаранні жылога дома на вуліцы Калгаснай у вёсцы Гарадзішча Слуцкага раёна.**

— Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, адкрытым полымем гарэла веранда жылой аднапавярховай хаты, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Звяном газадымаахоўнай службы ў пакоі былі выяўленыя муж і жонка, іх дачка і яшчэ адна жанчына. Ратавальнікі вывелі іх на свежае паветра. Ніхто не пацярпеў, медыцынская дапамога не спатрэбілася. У выніку агнём пашкоджаны прыбудаваная драўляная веранда і дах на плошчы 16 квадратных метраў.

Прычынай пажару ў МУС назвалі падпал, які з мэтай забойства здзейсніў жыхар Слуцка. Ранкам ён пасля сваркі, якой папярэднічала сумеснае ўжыванне алкаголю, падпаліў жыллё, дзе знаходзіліся людзі.

## Прапалі мінібайк, вопратка, абутак і кава...

**У сталічную міліцыю звярнуліся ўладальнікі трох гаражоў, размешчаных па вуліцы Чыгуначнай. З памяшканняў былі скрадзены 54 пары абутку, 54 курткі на агульную суму 4320 рублёў, 10 пачак кавы коштам 200 рублёў і мінібайк «Рокет-50» коштам 800 рублёў.**

Аператыўнікі ўстанавілі, што крадзеж здзейсніў беспрацоўны 23-гадовы мінчанін. Гараж маладога чалавека знаходзіўся па суседстве з тымі, дзе была скрадзена маёмасць. У агляднай яме былі знойдзены зніклыя рэчы. Хлопцу можа пагражаць пазбаўленне волі тэрмінам да чатырох гадоў. Раней яго прыцягвалі да крымінальнай адказнасці за ўгон транспартнага сродку.

## Украў грошы ў бацькоў сваёй дзяўчыны

**Супрацоўнікамі аддзела крымінальнага вышуку Савецкага РУУС сталіцы затрыманы раней не судзімы непрацуючы 19-гадовы мінчанін, які здзейсніў крадзеж 6 тысяч долараў з кватэры бацькоў сваёй дзяўчыны.**

Ён неаднаразова быў сведкам таго, як тыя дасталі з «тайніка» адкладзеныя на рамонт кватэры грашовыя сродкі. Выбраўшы момант, малады чалавек здзейсніў крадзеж. Грошы за тыдзень былі патрачаны на кішэнныя выдаткі. Бацькі дзяўчыны, даведаўшыся, што іх зберажэнні выкраў знаёмы дачкі, запатрабавалі вярнуць грошы, а пасля адмовы звярнуліся ў міліцыю.

Заведзена крымінальная справа за крадзеж, злачынства, учыненае ў буйным памеры, якое караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі, паведамілі ў Савецкім РУУС г. Мінска.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Год малой Радзімы

# НАСМЕЦІЛІ... У ЗАКАЗНІКУ

## Частку асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыі камунальнікі выкарыстоўвалі пад міні-палігон адходаў

У Год малой Радзімы кіраўніцтвам дзяржавы асаблівая ўвага ўдзяляецца пытанням навядзення парадку і выканання прыродаахоўнага заканадаўства — і гэта датычыцца не толькі аб'ектаў жыллёвага фонду краіны, тэрыторый прадпрыемстваў, грамадскіх месцаў, але і ўнікальных прыродных комплексаў. Многія з такіх прыродных аб'ектаў маюць асаблівае экалагічнае, навуковае і эстэтычнае значэнні. І каб захаваць іх, у краіне існуе і развіваецца сетка асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, у дачыненні да якіх устаноўлены асаблівы рэжым аховы і выкарыстання.

Выкананне патрабаванняў прыродаахоўнага заканадаўства на ААПТ знаходзіцца на спецыяльным кантролі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Кіраўнік ведамства Андрэй Худык перад дзяржаўнымі інспектарамі па ахове прыроды паставіў задачу сёлета ва ўсіх рэгіёнах краіны выявіць і не дапусціць дзейнасць, якая можа нанесці шкоду прыродным комплексам і аб'ектам і супярэчыць мэтам і задачам, пастаўленым падчас абвяшчэння ці пераўтварэння асабліва ахоўных прыродных тэрыторый.

Першыя парушэнні экалагічнага заканадаўства на ААПТ, на жаль, не прымусілі чакаць сябе. Раскіданыя пластыкавыя бутэлькі, поліэтыленавая плёнка, рэшткі будматэрыялаў і старое адзенне — падчас палявых мерапрыемстваў інспектары па ахове прыроды выявілі на тэрыторыі заказніка «Сялява», што ў Крупскім раёне Мінскай вобласці, сапраўдны дзеючы міні-палігон.

Пры гэтым, згодна з Палажэннем аб рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Сялява», зацверджаным пастановай Савета Міністраў ад 2 ліпеня 2014 года № 648, на яго тэрыторыі забаронена размяшчэнне адходаў, за выключэннем часовага іх трымання да перавозкі на аб'екты захавання, абясшкоджвання ці выкарыстання. Нягледзячы на забарону, Крупскае КУП «Жылцеплабуд» працягвала эксплуатацыю міні-палігона вёскі Дуброўка. Па факце выяўленага парушэння пачаты адміністрацыйны працэс.



**Арт. 15.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях «Парушэнне рэжыму аховы і выкарыстання асабліва ахоўных прыродных тэрыторый» цягне накладанне штрафу ў памеры ад 4 да 35 базавых велічынь на фізічную асобу, да 500 базавых велічынь — на юрыдычную асобу.**

— Усе спецыялізаваныя службы і адказныя асобы павінны ўсвядоміць — патрабаванні прыродаахоўнага заканадаўства, у тым ліку тыя, што датычацца аховы і выкарыстання асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, неабходна выконваць безагаворачна. У адваротным выпадку ўсе вінаватыя панясуць адпаведную адказнасць, — адзначылі ў Мінпрыроды.

Вераніка **КОЛАСАВА**

■ Надзённае

# Без перашкод для жывой прыроды

## У Беларусі зацверджана Схема нацыянальнай экалагічнай сеткі

**Галоўная мэта Схемы — забяспечыць падтрыманне экалагічнай раўнавагі, захаванне біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці, устойлівае развіццё тэрыторый. Яе рэалізацыя таксама дапаможа жывёлам бесперашкодна перамяшчацца з адной прыроднай тэрыторыі ў другую, пазбягаючы часам гібельнай сустрэчы з чалавекам і створанымі ім аб'ектамі.**

### Што такое экасетка?

Нацыянальная экалагічная сетка — гэта сістэма прыродна-тэрытарыяльных комплексаў са спецыяльнымі рэжымамі прыродакарыстання, якая забяспечвае натуральныя працэсы руху жывых арганізмаў і іграе важную ролю ў падтрыманні экалагічнай раўнавагі і забеспячэнні ўстойлівага развіцця тэрыторый (рэгіёна, краіны, кантынента), захаванні натуральных экалагічных сістэм, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці. У склад нацыянальнай экасеткі ўваходзяць 93 аб'екты агульнай плошчай 3,37 млн га (гэта 16,2 % тэрыторыі краіны).

Нацыянальная экалагічная сетка складаецца з зон ядраў, экалагічных калідораў і ахоўных зон.

*Ядры фарміруюць асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі (ААПТ) (іх часткі), а таксама прыродныя тэрыторыі, якія падлягаюць спецыяльнай ахове (іх часткі).*

*Экалагічныя калідоры забяспечваюць сувязь паміж зонамі ядраў. Яны ствараюць магчымасці для распаўсюджвання і міграцыі відаў дзікарослых раслін і дзікіх жывёл.*

*У ахоўныя зоны ўключаюцца прыродныя тэрыторыі, што падлягаюць спецыяльнай ахове, не ўключаныя ў зоны ядраў і экалагічныя калідоры.*

### Свабодная дарога

Як расказалі ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, на ААПТ і прыродных тэрыторыях, якія падлягаюць спецыяльнай ахове, уключаных у нацыянальную экалагічную сетку (ядрах і частках экалагічных калідораў), засталіся дзейнічаць рэжымы аховы і выкарыстання, устаноўленыя для іх падчас абвяшчэння (выдзялення) ці пераўтварэння.

Асноўныя змены закрануць экалагічныя калідоры. Каб забяспечыць свабоднае рассяленне і міграцыю дзікіх жывёл, плануецца рэалізацыя шэрагу мерапрыемстваў. Так, пры прапрацоўцы праектнай дакументацыі падчас праектавання, узвядзення, рэканструкцыі ўчасткаў аўтамабільных дарог неабходна будзе планаваць мерапрыемствы па прадухіленні гібелі земнаводных і капытных у месцах іх масавай міграцыі — будаўніцтва канструкцый для пропуску земнаводных і прадухілення іх выхаду на аўтадарогі. З гэтымі ж мэтамі пры праектаванні і будаўніцтве мастоў цяпер неабходна прадугледжваць пашырэнне мастовых прасветаў пры праходжанні над поймамі рэк з ахопам заліваемай часткі поймы, а таксама спецыяльныя накіравальныя сеткаватыя канструкцыі для прадухілення выхадаў каляводных жывёл і скарачэння іх смяротнасці ўздоўж поймянных участкаў вадацёкаў.

Для забеспячэння свабоднай міграцыі прахадных і мігрыруючых рыб (вугор рачны, сёмга, ласось, кумжа, лешч, сцерлядзь і інш.) запланавана аснашчэнне плацін на рэках спецыяльнымі рыбапрапускнымі збудаваннямі.

Акрамя таго, на ўсіх элементах, якія ўваходзяць у нацыянальную экалагічную сетку, забаронена размяшчэнне аб'ектаў трымання, захавання і выкарыстання адходаў.

Вераніка **КОЛАСАВА**




■ Міжнароднае супрацоўніцтва

# ПАЗБАВІЦЦА АД АДХОДАЎ ПАД НУЛЬ

## Мінпрыроды і пасольства Каралеўства Швецыя ў Беларусі разам працуюць над павышэннем узроўню кіравання адходамі ў нашай краіне

Супрацоўніцтва нашай краіны і Швецыі ў прыродаахоўнай сферы актыўна развіваецца: рэалізуюцца сумесныя праекты па водаачыстцы і водаадвядзенні ў беларускіх гарадах, адкрыўся біягазавы комплекс у Баранавічах. Сёлета Швецыя выдзеліць 11 млн еўра на рэалізацыю ў Беларусі экалагічных праектаў. Пашыраючы сферы супрацоўніцтва, Мінпрыроды сумесна са шведскімі партнёрамі правялі семінар «Smart city: кіраванне адходамі, эканоміка замкнёнага цыкла», для ўдзелу ў якім запрасілі прадстаўнікоў дзяржорганаў, парламентарыяў, мясцовай выканаўчай улады, ВНУ і навукі, бізнес-супольнасці, грамадскасці з усіх рэгіёнаў краіны.



«У Беларусі сітуацыя не ўнікальная, наш лад жыцця спрыяе з'яўленню велізарнай колькасці адходаў. Зямля не вытрымлівае такіх гор смецця, таму неабходная перапрацоўка, — заявіла падчас адкрыцця семінара **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Швецыі ў Беларусі Крысціна ЮХАНЕСАН.** — Адходы — гэта рэсурс, які можа быць выкарыстаны для эканамічнага росту і дабрабыту грамадзян. Мы дасягнулі такой глыбокай перапрацоўкі адходаў, што нават імпартуем іх з Нарвегіі і Вялікабрытаніі. Спадзяюся, што семінар будзе пачаткам паглыбленага абмену вопытам паміж Швецыяй і Беларуссю ў гэтай галіне, а таксама ў іншых кірунках, звязаных з канцэпцыяй Smart City (разумны горад. — **Аўт.**)».

**Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК** высока ацаніў супрацоўніцтва са Швецыяй у галіне экалогіі. Ён нагадаў, што праведзены летась семінар-трэнінг «Symbio City» у Брэсце выклікаў вялікую цікавасць грамадскасці.

*«Беларусь вызначыла стратэгію сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на найбліжэйшую перспектыву. Адзін з прыярытэтаў — ахова навакольнага асяроддзя з выкарыстаннем найлепшых практык міжнароднай супольнасці, — адзначыў Андрэй Худык. — Мы імкнёмся не толькі палепшыць агульны стан навакольнага асяроддзя, але і рэфармаваць падыходы да вырашэння розных сацыяльна-эканамічных праблем, выкарыстоўваць міжнародны вопыт. Мы арыентуемся на экалагічныя нормы Еўрасаюза, працуем над гарманізацыяй заканадаўства. Беларусь — першая на постсавецкай прасторы дзяржава, якая ўкараніла прынцып пашыранай адказнасці вытворцаў, а таксама распрацавала сістэму мер па пераходзе на зялёную эканоміку».*

Цяпер у Беларусі, па словах **намесніка міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзя ТРУБІЛЫ,** узровень выкарыстання камунальных адходаў дасягнуў 17 % — гэта ў 1,7 раза вышэй, чым у 2012-м. Каб дамагчыся такога выніку, МЖКГ удасканальвае сістэму кіравання камунальнымі адходамі. У 2017 годзе зацверджана Нацыянальная стратэгія па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі на перыяд да 2035 года, якая прадугледжвае павышэнне ўзроўню выкарыстання адходаў да 50 %.

Андрэй Худык падкрэсліў, што нашай краіне надзвычай цікавы вопыт Швецыі, дзе ўзровень выкарыстання камунальных адходаў складае каля 99 %. «Вельмі цікава, што стаіць за гэтай лічбай: эканамічнае стымуляванне, тэхналогіі, экалагічнае выхаванне або штрафныя санкцыі?» — задаўся пытаннем міністр. У перспектыве і нашай краіне хацелася б дасягнуць такіх паказчыкаў. Ён таксама адзначыў, што ў Беларусі праводзіцца дзяржаўная палітыка па лібералізацыі бізнесу і стварэнні спрыяльнага інвестыцыйнага клімату, і ў гэтай сувязі асабліва цікавы вопыт Швецыі па ўзаемадзеянні дзяржавы, бізнесу і грамадзян.

Эксперты Шведскага экалагічнага навукова-даследчага інстытута расказалі, што ў іх краіне перапрацоўкай смецця пачалі займацца ў 1966 годзе. Работа будавалася на прынцыпах прыватна-дзяржаўнага партнёрства. Пачатковы капітал складаў 1 млн долараў: 50 % — доля дзяржавы, 50 — бізнесу. З 1975 года ў Швецыі была распрацавана новая палітыка па абыходжанні з адходамі. Зараз менш за 1 % адходаў падлягаюць захаванню на палігонах. Спецыялісты са Швецыі кансультавалі калег практычна з усіх краін Усходняй Еўропы. Цяпер вядуць цікавыя праекты ў Кітаі і Індыі. На іх думку, для Беларусі ў гэты перыяд найбольш прыярытэтны адукацыйны складнік, таму што не важна, колькі ёсць грошай, калі людзі, прадпрыемствы не ведаюць, як іх выкарыстаць. Менавіта таму Мінпрыроды праводзіць серыі семінараў-трэнінгаў, у тым ліку запрашаючы замежных экспертаў, каб нашы спецыялісты пераймалі найлепшы сусветны вопыт.

Аксана **ЯНОЎСКАЯ**

■ Браты меншыя

# «Яны проста дзікія па прыродзе!»


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЧАМУ ЯНОТУ НЕ МЕСЦА Ў КАНТАКТНЫМ ЗААПАРКУ

**Добрая навіна: Мінпрыроды выступіла з прапановай забараніць выкарыстанне дзікіх жывёл у кантактных і перасовачных заапарках. Забарону плануюць уключыць у праект Закона «Аб абыходжанні з жывёламі», які ўжо даўно абмяркоўваецца. Чаму яе не ўнясуць ва ўжо існае прыродаахоўнае заканадаўства, і што будзе з янотамі, мядзведзямі і іх дзікімі сабратамі пасля прыняцця дакумента — на гэтыя і іншыя пытанні адказала кансультант аддзела біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяна ЖАЛЯЗНОВА.**

***— Кантактныя заапаркі з'явіліся ў нас каля двух гадоў таму. Чаму толькі зараз Мінпрыроды выступае з ініцыятывай аб іх забароне?***

— З прапановай забараніць выкарыстанне дзікіх жывёл у кантактных заапарках мы выйшлі адразу, як толькі такія звярынцы з'явіліся. Тады ж мы ўнеслі папраўкі ў праект закона, які прыйшоў да нас на ўзгадненне. Мы лічым, што выкарыстанне дзікіх звяроў у кантактных заапарках — гэта няправільна, бо апрыёры прыручыць іх, каб яны камфортна сябе адчувалі ў няволі, немагчыма. На шчасце, у нас няшмат выпадкаў, калі жывёлы кусалі людзей, але яны ўсё ж ёсць. І гэта не таму, што жыхары заапаркаў нейкія няправільныя. Яны проста дзікія па сваёй прыродзе!

***— Перасовачныя звярынцы ўжо таксама не першы год плануецца забараніць?***

— А вось гэтае патрабаванне мы ініцыявалі нядаўна. Падставай паслужылі парушэнні, заўважаныя ў Тульскім перасовачным заапарку. Неабыякавыя людзі праінфармавалі нас пра тое, што жывёлы ўтрымліваюцца там у неналежных умовах, і мы адразу ж выехалі на месца з праверкай. Высветлілася, што ўсе прабывальнікі звярынца трапляюць пад дзеянне міжнароднага дагавора СІТЭС і на іх патрэбны дазвольныя дакументы. Дакументаў нам не прад'явілі, а ўмовы ўтрымання жывёл былі відавочна парушаныя. Гэтаму звярынцу быў выпісаны штраф па двух артыкулах, а таксама выдадзены прадпісанні па ліквідацыі ўсіх парушэнняў. Зараз мы высвятляем, выканалі яны іх ці не. Як бачыце, мы са свайго боку дзейнічаем аператыўна. Але распрацоўшчыкамі закона не з'яўляемся, таму і паўплываць на час яго прыняцця не можам.

***— Ці часта да вас паступаюць скаргі на кантактныя і перасовачныя звярынцы?***


Фота БЕЛТА.

— Мы ўдзячныя ўсім неабыякавым людзям за своечасовае інфармаванне і скаргамі гэта не лічым. Стараемся рэагаваць на ўсе заклікі грамадскасці, паколькі не заўсёды можам ведаць, што адбываецца ў аддаленых рэгіёнах Беларусі. Вядома, любая заява павінна падмацоўвацца фактамі, а не проста фразамі «таму што гэта няправільна» або «мне гэта не падабаецца». У цэлым, падобных зваротаў не так шмат, але гэта з улікам, што пішуць нам, у асноўным, калектыўна. Так, наконт кантактных заапаркаў за апошнія два гады мы атрымалі шэсць зваротаў і прыкладна столькі ж — датычна перасовачных звярынцаў у канцы 2017 года.

У выніку праверак мы прыйшлі да высновы, што ні кантактныя, ні перасовачныя заапаркі не могуць забяспечыць дзікім жывёлам належныя ўмовы, якія прапісаны ў нашым заканадаўстве.

***— А што гэта за ўмовы?***

— У пастанове Мінпрыроды № 16 прапісаны нормы па ўтрыманні дзікіх жывёл. Калі казаць проста, то кожнага жыхара заапарка варта забяспечыць пэўнай колькасцю паілак, месцам для кармлення, спецыяльным навесам, куды ён можа схавацца. У рацыёне павінна прысутнічаць неабходная колькасць бялкоў і вітамінаў, пры гэтым ежа павінна адпавядаць той, якую жывёла атрымлівае ў дзікай прыродзе. Усё гэта мы правяраем. Таксама мы звяртаем увагу на выкананне патрабаванняў наконт тэмпературы, вільготнасці і ўльтрафіялету. Многія не звяртаюць увагі на асвятленне, думаючы, што гэта ніхто не заўважыць. За такія парушэнні мы выпісваем штрафы, якія значна вышэй за кошт ультрафіялетавай лямпы.

***— Ці шмат штрафаў было выпісана апошнім часам, і ці прадугледжаны новым праектам іншыя пакаранні?***

— На самай справе дзікіх жывёл у кантактных і перасовачных звярынцах у нас не так шмат, і практычна ўсіх мы ведаем «у твар». Таму штрафы выпісваюцца рэдка. Мы стараемся весці актыўную прапагандысцкую работу. Што датычыцца пакаранняў, то пакуль па заканадаўстве прадугледжаны толькі штрафы, таксама жывёла можа адбірацца ў выпадку яе незаконнага правозу на тэрыторыю нашай краіны. У новым законе прадугледжана канфіскацыя і ў выпадку парушэння патрабаванняў утрымання.

***— Што будзе з дзікімі жывёламі, якія ўсё жыццё пражылі ў заапарку, пасля ўступлення новага закона ў сілу?***

— Яны і далей будуць жыць у заапарках, толькі іншых, якія змогуць забяспечыць для іх усе неабходныя ўмовы. Паўтаруся, у нас цяпер у звярынцы не так шмат дзікіх жывёл, каб з гэтым узніклі праблемы.

***— Чаму папраўкі ўносяцца не ў існае прыродаахоўнае заканадаўства, а ў новы законапраект?***

— Закон «Аб абыходжанні з жывёламі» закранае не толькі дзікіх звяроў, а жывёл у цэлым. Кантактныя і перасовачныя заапаркі — гэта камбінацыя ўсіх жывёл, і каб вырашыць праблему комплексна, мы ўносім свае прапановы ва ўжо падрыхтаваны законапраект.

**Кацярына ЦІТОВА**

■ У свеце раслін

# Не купляйце першацветы!

### Невялікі букецік — значны «ўнёсак» у знішчэнне прыроды

**Прыгожыя, а галоўнае, першыя кветкі так і прываблів止юць «пераходных» гандляроў. Толькі ў лесе зацвітуць першацветы, як з усіх бакоў табе прапануюць набыць яркі букецік з пралесак ці духмяны пучок чарамшы. І кожны год абаронцы прыроды стараюцца спыніць незаконны гандаль, каб захаваць рэдкія расліны, якія і ў лесе цвітуць менш за месяц, а ў сарваным выглядзе пражывуць не больш за два дні. Таму ведайце, калі купляеце букецік чырванакніжнікаў — падтрымліваеце знішчэнне прыроды.**

Вядома, вырасціць першацветы можна і дома, але гандляры выбіраюць больш просты шлях — узяць іх з лесу. Па словах **загадчыка сектара кадастру расліннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алега МАСЛОЎСКАГА,** толькі 5 % з усіх вулічных гандляроў маюць неабходныя дакументы для продажу, астатнія з'яўляюцца нелегаламі. І самы дзейсны спосаб барацьбы з імі — не павышаць попыт на такі тавар.

— Сёння вы купіце букецік, а заўтра гэты гандляр вынесе з лесу яшчэ больш кветак, а побач з'явяцца такія ж нелегалы. Не сакрэт, што калі ёсць попыт — ёсць і прапанова, — адзначыў Алег Маслоўскі. — Вось ва Украіне, напрыклад, тымі, хто гандлюе чырванакніжнікамі, займаюцца грамадскія арганізацыі: штрафы яны, вядома, не выпісваюць, а вось прысароміць могуць. Лічу, што і ў нас трэба праводзіць прафілактычныя размовы, а не толькі штрафаваць. Паколькі на ўсіх інспектараў не хопіць.

У Чырвоную кнігу Беларусі ўключаны пакуль толькі дзесяць відаў першацветаў: раўнаплоднік пылюшнікавы, сон расчынены (сон-трава), сон лугавы, чубатка пустая, чубатка прамежкавая, фіялка багнавая, медуніца вузкалістая, медуніца мякенькая, гусіная цыбуля пакрывальцавая і чарамша. Акрамя гэтага, ёсць віды са Спіса раслін і грыбоў, якія маюць патрэбу ў прафілактычнай ахове, бо пры масавым знішчэнні і яны могуць папоўніць шэрагі чырванакніжнікаў. Самыя вядомыя з іх: пралеска высакародная, першацвет высокі, воўчнік звычайны, белакапытнік гібрыдны, падснежнік беласнежны.

— Першацветы вельмі ўразлівыя расліны, паколькі яны расцвітаюць першыя і жывуць усяго два-тры тыдні. За гэты кароткі перыяд ім патрэбна паспець назапасіць насенне на наступны год,


Фота Ірыны СЫСОЙ.
**Сон расчынены.**

пакуль не заглушыць трава. А масавы збор першацветаў падрывае колькасць іх папуляцый і здольнасць да вегетацыі. Яны не паспяваюць размнажыцца, — падкрэсліў спецыяліст. — Таму не трэба ўвогуле чапаць першацветы. Ёсць жа шмат садовых кветак, а першацветамі любуйцеся ў прыродзе!

Зараз вучоныя імкнуцца захаваць вясновыя расліны на тых тэрыторыях, дзе яны амаль зніклі. Асабліва гэта датычыцца буйных гарадоў — асноўных месцаў гандлю. Для таго каб высветліць, якія аб'екты трэба ўзяць пад ахову ў першую чаргу, **навуковы супрацоўнік Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі Анастасія ЛЯЎКОВІЧ** навучылася «прадказваць» лёс першацветаў. Пры дапамозе матэматычных разлікаў яна можа вылічыць, колькі раслін засталося на той ці іншай тэрыторыі, а таксама якія з іх знаходзяцца ў крытычным стане.

* * *

Мінпрыроды папярэджвае, што ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб раслінным свеце», забараняецца самавольныя канфіскацыі і перасадкі дзікарослых раслін, якія адносяцца да відаў, уключаных у Чырвоную кнігу, з асяроддзя іх росту, іх незаконны абарот, а таксама выдаленне і ўчыненне іншых дзеянняў, якія могуць прывесці да іх гібелі, скарачэння колькасці або парушэння асяроддзя іх росту.

За парушэнне гэтых патрабаванняў вінаватыя асобы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці ў адпаведнасці з артыкулам 15.8 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і караюцца штрафнымі санкцыямі ў памеры ад дваццаці да пяцідзесяці базавых велічынь.

**Кацярына КІРЭЕВА**


Фота Анастасіі ЛЯЎКОВІЧ.
Пралеска высакародная.

## Дзякуй!

# ПОМНІМ МЫ? УСПОМНЯЦЬ НАС

**Усе людзі розныя: нехта заўважае вакол сябе найперш недахопы, усё крытыкуе, а я дык наадварот — стараюся бачыць добрае як у асобных людзях, так і ў жыцці наогул. Апошнім часам, напрыклад, мяне вельмі парадавалі адносіны кіраўніцтва УП «Мінсккамунсеткі» да сваіх супрацоўнікаў, да ветэранаў.**

Сярод іх быў (як ні цяжка з гэтым змірыцца) і мой родны брат Уладзімір. Больш за 20 гадоў ён працаваў у гэтай арганізацыі звычайным рабочым, пайшоў на заслужаны адпачынак — і таксама амаль 20 гадоў таму. Але — як ні дзіўна — на прадпрыемстве пра яго не забыліся: напярэдадні Дня пажылых людзей брат атрымліваў віншаванні, а ў апошнія гады — яшчэ і матэрыяльную дапамогу. Для яго, цяжкахворага, яна была вельмі патрэбная і вельмі дарагая. Аднак....

Сёлета, на пачатку года брата не стала. Аб гэтым мы паведамілі не толькі блізкім, але і на прадпрыемства — каб там, у прыватнасці, больш не клапаціліся...

Якое ж было здзіўленне, калі нашай сям'і не проста паспачувалі, але і прапанавалі матэрыяльную дапамогу на пахаванне. Мы атрымалі яе і ўсё роўна не маглі паверыць, расказвалі іншым, але яны таксама не верылі...

Пасля гэтага мне захацелася бліжэй пазнаёміцца з прадпрыемствам, і ў выніку я даведалася, што працуе там больш за 1200 чалавек, што «Мінсккамунсеткі» адказныя за стан камунікацый і падачу цяпла, што яны апературыўна ліквідуюць усе пазаштатныя сітуацыі.

Прыемна здзівіла, што з сумленнымі працаўнікамі там заключаюць кантракты мінімум на тры гады, што пры скарачэнні кадраў забаронена звальненне работніц, якія маюць малых ва ўзросце да чатырох гадоў і дзяцей з інваліднасцю, што апроч гэтага калектыўным дагаворам прадугледжаны розныя матэрыяльныя дапамогі — пры заключэнні шлюбу, нараджэнні дзяцей, у выпадках працяглай хваробы, увосень пры нарыхтоўцы гародніны...

Усё пералічыць, відаць, не атрымаецца, бо ўвогуле стаўленне да людзей на гэтым прадпрыемстве нагадала мне канцэрт, прысвечаны 50-годдзю Дзяржаўнага камернага аркестра. У фінале яго дырыжор Яўген Бушкоў аб'явіў: «А зараз на сцэну выйдуць музыкі, якія працавалі ў нас раней».

І аркестр тады павялічыўся больш чым удвая, а музыка ў яго выкананні здавалася праходзіць праз сцены філармоніі і лунае над усёй краінай!

...Мне здаецца, што гэта толькі два, але ж цудоўныя прыклады, на якіх многім трэба вучыцца помніць людзей, помніць сваіх ветэранаў.

**Соф'я Жыбулеўская,** *г. Мінск*

## Ад прадзедаў...

# За святочным сталом

Вялікдзень — самае галоўнае, самае светлае свята. У нашай сям'і да яго рыхтуюцца згодна з традыцыямі, якія перадавала мама. Яна (светлай памяці!) некалі скончыла гімназію, працавала настаўніцай і нас, сваіх дачок, вучыла, як трэба жыць, як што рабіць, каб велікодны стол — у прыватнасці — быў не толькі традыцыйна багаты, але яшчэ і прыгожы.

Для гэтага і перш-наперш трэба выцягнуць з шафы самы прыгожы абрус. У мяне, напрыклад, захавалася некалькі дарагіх майму сэрцу — маміных, на якіх яе рукамі вышыты цудоўныя валошкі, макі, каласкі.

Далей — на Вялікдзень мы ўспамінаем (можна паасобку, можна разам) яго асноўныя сімвалы: жыцця — у выглядзе яйка, святла — запаленых свечак і абнаўлення — кветак, галінак, зялёнай травы...

Каб вырасціць яе, дзён за дзесяць да свята змешваем зярняты пшаніцы з зямлёй, высыпаем яе ў глыбакаватае блюда альбо талерку, паліваем вадой так, каб атрымалася вадкая кашка, і ставім у цёплае месца. Потым, калі насенне пачне прарастаць, выносім «градку» на падаконне, на сонейка і кожны дзень паварочваем.

Перад самым святам нам застанецца расфарбаваць яйкі ў розныя колеры, на кожным намаляваць, напрыклад, пыску зайчыка (вушкі можна зрабіць са шчыльнай паперы) і «запусціць» на траву.

Упрыгожаць стол і самаробныя вазачкі з размаляванай яечнай шкарлупіны. Унутр яе наліваецца трошкі вады, ставяцца першыя маленькія кветачкі — падснежнікі, пралескі, крокусы... Паверце, некалькі такіх букецікаў (падстаўкі пад вазачкі можна зрабіць з палосак кардону) здольны ўразіць больш, чым самая рэдкая страва!

У цэнтры стала добра паставіць букецік з галінак вярбы, на якія з дапамогай чырвоных атласных стужак і скотча можна павесіць пафарбаваныя выдзьмутыя яечкі...

Як бачыце, прыгажосць святочнага стала не патрабуе асаблівых выдаткаў, але яна ўражвае, запамінаецца ўсім бяседнікам — асабліва дзецям. Да таго ж яны з ахвотай дапамагаюць дарослым, а заадно — вучацца як што рабіць, каб перадаць традыцыі далей.

**Сафія Кабарыха,**
*в. Паланечка, Баранавіцкі раён*

## Весткі з месцаў

# БАБУЛІНЫ ПРЫСМАКІ

**Надоечы ў нас у Цэнтралізаванай клубнай сістэме разліваліся чароўныя пахі, якія ішлі ад толькі што прыгатаваных салатаў, рулетаў, выпечкі... На базе ўстановы праходзіў кулінарны конкурс «Бабуліны прысмакі — 2018».**



Удзел у ім прынялі 13 жанчын. Усе стравы, прыгатаваныя імі, вылучаліся не толькі адменным смакам, але і арыгінальным аўтарскім афармленнем. Здавалася, кожная з канкурсантак была вартая звання найлепшай! Але ж пераможцай сярод кандытараў журы прызнала Алу Карнацкую, салатамі і закускамі найбольш уразіла Любоў Сірыська, у Ганны Грышкевіч аказалася самая смачная сімволіка, у Ларысы Сысун — ветэранскія пірагі, у Кацярыны Малец і Тамары Троцкай — стравы нацыянальнай кухні. Прызёры раённага конкурсу змогуць праявіць свае здольнасці яшчэ і на абласным.

**Надзея СТАНКЕВІЧ,** *г. Маладзечна.*




### Извещение о проведении аукциона

**Организатор аукциона:** ООО «Юридическая компания «Приоритет», 211415, г. Полоцк, ул. Нижнепокровская, 41 Б, пом. 26.

**Продавец**: ТПУП «Торговый дом «Коптево», г. Новополоцк, пер. Рижский, 10.

**Лот № 1.** Торговое оборудование – горка из ДСП (пристенная). Начальная цена с НДС 20 % – 1487,77 руб. Шаг аукциона: 74,39 руб.

**Лот № 2.** Торговое оборудование – подиум, столы. Начальная цена с НДС 20 % – 734,88 руб. Шаг аукциона: 36,74 руб.

**Лот № 3.** Источники бесперебойного питания. Начальная цена с НДС 20 % – 241,39 руб. Шаг аукциона: 12,07 руб.

**Лот № 4.** Плита из минваты на синтетическом связующем тепло- и звукоизоляционная. По 10 шт. в одном лоте. Начальная цена с НДС 20 % за 1 лот – 18,00 руб. Шаг аукциона: 0,90 руб. Общее количество лотов № № 4.1 – 4.126 – 126.

**Лот № 5.** Противопожарное оборудование (огнетушители, полотно). Начальная цена с НДС 20 % – 30,46 руб. Шаг аукциона: 1,52 руб.

**Лот № 6.** Поддоны, 18 шт. Начальная цена с НДС 20 % – 27,49 руб. Шаг аукциона: 1,37 руб.

**Лот № 7.** Изделия прошивные из базальтового штапельного волокна (в рулонах). По 10 шт. в одном лоте. Начальная цена с НДС 20 % – 18,00 руб. Шаг аукциона: 0,90 руб. Общее количество лотов № № 5.1 – 5.32 – 32.

**Лот № 8.** Вата БСТВ. Начальная цена с НДС 20 % – 17,37 руб. Шаг аукциона: 0,87 руб.

**Лот № 9.** Материал прессованный на основе базальтового волокна. Начальная цена с НДС 20 % – 29,52 руб. Шаг аукциона: 1,48 руб.

**Лот № 10.** Ящик деревянный 1300*1600 мм, 2 шт. Начальная цена с НДС 20 % – 53,32 руб. Шаг аукциона: 2,67 руб.

**Место нахождения имущества** – Витебская обл., г. Новополоцк, пер. Рижский, д. 10.

**Порядок ознакомления с предметом аукциона:** понедельник–пятница с 09.00 до 17.00. Ответственное лицо: Михайлов Сергей Валерьевич, тел. +375 29 2314901.

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY50RSHN30126753800180000000 (BYN) в ЦБУ ЗАО «Банк «Решение» № 02/01 г. Витебск, BIC RSHNBY2X, получатель платежа – ООО «Юридическая компания «Приоритет», УНП 391609018.

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона. **Срок оплаты:** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи.

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утв. пост. СМ РБ от 08.01.2013 № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». В случае признания торгов **несостоявшимися** в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %. **Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов.

**Предыдущие** извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 11.04.2017, 23.05.2017, 07.06.2017, 21.06.2017, 14.07.2017, 27.07.2017, 12.08.2017, 29.08.2017, 18.01.2017.

**Аукцион состоится:** 11.04.2018 в 11.00 по месту нахождения организатора торгов.

**Дата и время окончания приема документов:** 10.04.2018 до 17.00 по указанному адресу организатора торгов. **E-mail: yur_k_prioritet@mail.ru. Тел.: +375 0214 46 25 89; +375 29 2314901**


## Ёсць прапанова

# Будаваць таксама трэба, але...

**Кожны год у нашай краіне праводзіцца агульнарэспубліканскі суботнік. Грошы, зароблены на ім, трацяцца, вядома ж, на патрэбнае: на будаўніцтва пэўных аб'ектаў, на добраўпарадкаванне тэрыторый, на абнаўленне помнікаў, але...**

Амаль кожны дзень у сродках масавай інфармацыі гучаць просьбы аб дапамозе цяжкахворым дзецям, якім неабходна дарагое лячэнне. У краіне ёсць розныя дабрачынныя фонды, але іх магчымасці абмежаваныя. У сувязі з гэтым у мяне ёсць прапанова: усе альбо значную частку заробленых на агульнарэспубліканскім суботніку грошай накіраваць у гэтыя фонды. Такім чынам мы дапаможам бацькам справіцца з бедамі, якія прыйшлі ў іх сем'і, і самі атрымаем станоўчыя эмоцыі ад таго, што здзейснілі высакародны ўчынак.

**Валянцін Гушча,** *г. Асіповічы.*

## Так ці не. Практыкум

# Не блытаць вечка з накрыўкай

**«У нашай мове ёсць словы безгаспадарны, безгаспадарчы і безгаспадарлівы. Падкажыце, дзе якое ўжываецца? Тое ж у мяне з «векам» («вечкам») і «накрыўкай». Як іх не зблытаць?» — пытае спадар Раман з Гродна. Спадарыня Аляксандра Сайкоўская з Мінска просіць дапамогі ў размежаванні слоў «стасункі», «зносіны», «адносіны» і «дачыненне».**

Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.

1. Рэчы, якія нікому не належаць, мы называем **безгаспадарнымі**: *безгаспадарная маёмасць, безгаспадарны чамадан*. **Безгаспадарлівым** можна назваць чалавека, які не ўмее разумна весці гаспадарку, якога лічаць неэканомным: *безгаспадарлівы кіраўнік*. **Безгаспадарчы** — сінонім безгаспадарлівага: *як можна быць такім безгаспадарчым*!

2. Галоўнае адрозненне паміж словамі **накрыўка** і **века** ў тым, што, паводле азначэння, века з'яўляецца *часткай* прадмета, які яно накрывае. Гэта значыць, што, напрыклад, века куфра не бярэцца аднекуль і кладзецца наверх, а прымацавана да самога куфра. Вечкі, за якімі схаваны кнопкі аварыйнага выключэння дзвярэй у нашым грамадскім транспарце, таксама мацуюцца завесамі. Адсюль — тое, што называецца словам *века*, павінна асацыявацца з «дзверцамі», якія адчыняюцца і зачыняюцца.

Накрыўка можа быць у бутэлькі (не блытаць з коркам, які ўсоўваецца ўнутр рыльца), у слоіка, у вядра, у каструлі, бочкі... Як відаць, у гэтых выпадках словам *накрыўка* названа тое, што цалкам здымаецца, прыбіраецца з прадмета, які яно накрывае.

3. **Дачыненне** — гэта сувязь нейкіх з'яў, аб'ектаў. Напрыклад, фразу «Ці маеш ты нейкае дачыненне да канцэрта?» можна па-іншаму сфармуляваць так: «Ці звязаны ты неяк з канцэртам?»

Назоўнік **зносіны** можа абазначаць дзелавыя, іншыя сувязі паміж некім: зносіны з замежнымі дзяржавамі, гандлёвыя зносіны. Сёння гэтае слова часта ўжываецца, калі трэба падкрэсліць, што гаворка ідзе пра адносіны паміж людзьмі, у час якіх яны камунікуюць, размаўляюць: *мы ўжо даўно не маем з ім зносін*. Гэтым жа словам абазначаюць сродкі перамяшчэння, сувязі: *аўтобусы прыгарадных зносін*.

**Стасункамі** сёння звычайна называюць асабістыя адносіны паміж сябрамі, закаханымі. Цікава, што раней гэтае слова магло абазначаць тое, што і *стаўленне*.

Нягледзячы на ўжыванне *стасункаў* класікамі нашай літаратуры, некаторыя навукоўцы лічаць яго непажаданым паланізмам. З сучасных слоўнікаў яно ёсць, напрыклад, у «Беларуска-рускім тлумачальным слоўніку новых слоў і новых значэнняў слоў».

Дарэчы, **стаўленне** (як сінонім адносін) — гэта пагляд на што-небудзь або разуменне чаго-небудзь. Напрыклад, у сучасных анкетах часам просяць выказаць сваё стаўленне да алкаголю і курэння, г. зн. паведаміць, як мы іх разглядаем: як нешта добрае, дрэннае або нейтральнае. Слова абазначае таксама характар паводзін, абыходжання каго-небудзь з кім- або чым-небудзь: *яго стаўленне да жонкі заўважалі ўсе*.

Паводле даведнікаў, найбольш універсальнае са слоў, што названы ў пытанні, **адносіны**. Яно, з пэўнымі агаворкамі, можа ўжывацца ў значэннях усіх разгледжаных вышэй назоўнікаў. Найбольш адметным, «сваім» для яго, відаць, з'яўляецца значэнне «ўзаемная сувязь, залежнасць з'яў або іх кампанентаў», у якім яно збліжаецца са словам **суаднósiны**: *адносіны прычыны да выніку*.

Аднак гэтая ўніверсальнасць адносін не робіць слова незаменным. Каб падкрэсліць канкрэтнае значэнне, у многіх выпадках варта ўжыць адпаведны сінонім.

**У АБАРОНУ СЛОЎ**

Апошнім часам назіраюцца закіды ў бок слова **аранжавы**. Яно нібыта лішняе ў сучаснай мове. Аднак настолькі жорстка ставіцца да гэтай назвы колеру зусім не варта, бо яна была ў даведніках 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Да таго ж сёння слова больш зразумелае і звыклае для многіх у параўнанні са сваімі заменнікамі.

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 31 декабря 2017 года

| | |
|---|---|
| Организация | ОАО «СТРОЙТЕХПРОГРЕСС» |
| Учетный номер плательщика | 100 950 748 |
| Вид экономической деятельности | Производство прочих машин и оборудования |
| Организационно-правовая форма | Акционерное общество |
| Орган управления | Общее собрание акционеров, наблюдательный совет |
| Единица измерения | тыс. руб. |
| Адрес | 220114, г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 21 |

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 9472 | 6648 |
| Нематериальные активы | 120 | 21 | 6 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | 28 | 30 |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | 28 | 30 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | – | – |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | – | – |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 1683 | 2676 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | – | – |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 9 | 9 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | – | – |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | – | – |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **11 213** | **9369** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 4463 | 2913 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 2591 | 1672 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | – | – |
| незавершенное производство | 213 | 1872 | 1241 |
| готовая продукция и товары | 214 | – | – |
| товары отгруженные | 215 | – | – |
| прочие запасы | 216 | – | – |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | 12 077 | 5492 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 28 | 24 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 1958 | 690 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 3937 | 4272 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | – | – |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 3369 | 2487 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | – | – |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **25 832** | **15 878** |
| **БАЛАНС** | **300** | **37 045** | **25 247** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 10 117 | 10 117 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | – | – |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | – | – |
| Резервный капитал | 440 | – | – |
| Добавочный капитал | 450 | 1139 | 711 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 4787 | 3003 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | | – |
| Целевое финансирование | 480 | – | – |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **16 043** | **13 831** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | – | – |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | – | – |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 540 | – | – |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | – | – |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | – | – |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **–** | **–** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | – | – |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 3343 | 3343 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 17 659 | 8073 |
| в том числе: | | – | – |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 1191 | 1129 |
| по авансам полученным | 632 | 925 | 1005 |
| по налогам и сборам | 633 | 162 | 239 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 109 | 74 |
| по оплате труда | 635 | 280 | 213 |
| по лизинговым платежам | 636 | – | – |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | – | |
| прочим кредиторам | 638 | 14 992 | 5413 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 650 | – | – |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | – | – |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | – | – |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **21 002** | **11 416** |
| **БАЛАНС** | **700** | **37 045** | **25 247** |

## ОТЧЕТ
## о прибылях и убытках за январь – декабрь 2017 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 года | За январь – декабрь 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 11 039 | 8782 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (7240) | (5329) |
| Валовая прибыль | 030 | 3799 | 3453 |
| Управленческие расходы | 040 | (1761) | (1289) |
| Расходы на реализацию | 050 | – | – |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 2038 | 2164 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 424 | 2084 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (607) | (2284) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 1855 | 1964 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 391 | 744 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 5 | 91 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | – | – |
| проценты к получению | 103 | 156 | 449 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 230 | 204 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (187) | (241) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (1) | (83) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (186) | (158) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 91 | 165 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 67 | 162 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 24 | 3 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (40) | (36) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | – | (13) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (38) | (16) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (2) | (7) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 255 | 632 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 2110 | 2596 |
| Налог на прибыль | 160 | (308) | (486) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | – | – |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | – | – |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | – | – |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (18) | (18) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 1784 | 2092 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 428 | 711 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | – | – |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 2212 | 2803 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | – | |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | – | – |

Руководитель — В. В. Колоша

Главный бухгалтер — И. М. Кенть

23 марта 2018 г.

*Директору ОАО «Стройтехпрогресс»*
В. В. Колоше

от 22.02.2018

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
### по бухгалтерской отчетности за 2017 г.
### ОАО «Стройтехпрогресс»

**Аудируемое лицо: ОАО «Стройтехпрогресс».**
**Местонахождение:** 220114, г. Минск, ул. Ф. Скорины, дом 21.
Свидетельство о государственной регистрации № 0000043 выдано на основании решения Минского горисполкома от 15.04.2009.
**УНП** 100950748.
**Аудиторская организация: ЗАО «МастерАудит и Консультации».**
**Местонахождение:** 220070, г. Минск, пр-т Партизанский, 45, пом. 2 Н.
Свидетельство о государственной регистрации № 0098542 выдано на основании решения Минского горисполкома от 06.04.2015.
**УНП** 191373133.

#### Аудиторское мнение

Мы провели аудит годовой бухгалтерской отчетности **ОАО «СТРОЙТЕХПРОГРЕСС»**, состоящей из бухгалтерского баланса по состоянию на 31 декабря 2017 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, примечаний к бухгалтерской отчетности, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.

По нашему мнению, прилагаемая годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение **ОАО «СТРОЙТЕХПРОГРЕСС»** по состоянию на 31 декабря 2017 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

#### Основание для выражения аудиторского мнения

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства и нормы профессиональной этики. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

#### Обязанности аудируемого лица по подготовке бухгалтерской отчетности

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке бухгалтерской отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в бухгалтерской отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки бухгалтерской отчетности аудируемого лица.

#### Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской отчетности

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что бухгалтерская отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей бухгалтерской отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

– выявляем и оцениваем риски существенного искажения бухгалтерской отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений бухгалтерской отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;

– получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;

– оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в бухгалтерской отчетности;

– оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности, и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в бухгалтерской отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;

– оцениваем общее представление бухгалтерской отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли бухгалтерская отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Директор — Л. А. Обухова
Аудитор — А. М. Хоружая

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
На 31 декабря 2017 г.

| | |
|---|---|
| Организация | **ОАО «Лидапищеконцентраты»** |
| Учетный номер плательщика | 500021268 |
| Вид экономической деятельности | 10899 |
| Организационно-правовая форма | Частная |
| Орган управления | Собрание акционеров |
| Единица измерения | тыс. руб. |
| Адрес | г. Лида, ул. Тавлая, 11 |

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2017 г. | На 31 декабря 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 6006 | 6078 |
| Нематериальные активы | 120 | 2 | 7 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | 63 | 6 |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | 6 | 6 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | 57 | – |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | – | – |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 68 | 12 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 2 | 2 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | – | – |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | – | – |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | – | – |
| **ИТОГО по разделу I** | 190 | **6141** | **6105** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 2671 | 2740 |
| В том числе: материалы | 211 | 1228 | 891 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | – | – |
| незавершенное производство | 213 | 265 | 191 |
| готовая продукция и товары | 214 | 1178 | 1658 |
| товары отгруженные | 215 | – | – |
| прочие запасы | 216 | – | – |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | – | – |
| Расходы будущих периодов | 230 | 10 | 14 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 35 | 107 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 3896 | 4406 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | – | – |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 201 | 98 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | – | – |
| **ИТОГО по разделу II** | 290 | **6813** | **7365** |
| **БАЛАНС** | 300 | **12 954** | **13 470** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 2062 | 2062 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | – | – |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | – | – |
| Резервный капитал | 440 | – | – |
| Добавочный капитал | 450 | 3304 | 3321 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 3182 | 1332 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | – | – |
| Целевое финансирование | 480 | – | – |
| **ИТОГО по разделу III** | 490 | **8548** | **6715** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 139 | 402 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | – | – |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 540 | 6 | 8 |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | – | – |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | – | – |
| **ИТОГО по разделу IV** | 590 | **145** | **410** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 1694 | 2771 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 0 | 227 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 2558 | 3338 |
| В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 1478 | 2558 |
| по авансам полученным | 632 | 18 | 14 |
| по налогам и сборам | 633 | 156 | 155 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 71 | 51 |
| по оплате труда | 635 | 245 | 218 |
| по лизинговым платежам | 636 | 69 | – |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 501 | 325 |
| прочим кредиторам | 638 | 20 | 17 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 650 | 9 | 9 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | – | – |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | – | – |
| **ИТОГО по разделу V** | 690 | **4261** | **6345** |
| **БАЛАНС** | 700 | **12 954** | **13 470** |

## ОТЧЕТ
## о прибылях и убытках за 2017 г.

| Наименование показателей | Код строки | За 2017 г. | За 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 21 496 | 19 413 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 12 029 | 12 099) |
| Валовая прибыль | 030 | 9467 | 7314 |
| Управленческие расходы | 040 | 3058 | 2757 |
| Расходы на реализацию | 050 | 2584 | 2056 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 3825 | 2501 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 1340 | 965 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 1680 | 1284 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 3485 | 2182 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 19 | 16 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 1 | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | 1 | 1 |
| проценты к получению | 103 | 5 | – |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 12 | 15 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | 2 | 1 |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | 2 | – |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | – | 1 |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 140 | 227 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 140 | 227 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | – | – |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | 629 | 994 |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | 407 | 733 |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | 220 | 261 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | 2 | – |

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 года | За январь – декабрь 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130) | 140 | (472) | (752) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 3013 | 1430 |
| Налог на прибыль (Д99К68) | 160 | 626 | 324 |
| Изменение отложенных налоговых активов (09) | 170 | – | – |
| Изменение отложенных налоговых обязательств (65) | 180 | – | – |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) (Д99К68) | 190 | – | – |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | 69 | 55 |
| Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200-205-206) | 210 | 2318 | 1051 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | – | – |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | (10) | – |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 2308 | 1051 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | – | – |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | – | – |

Руководитель — Гончаров А. А.

Главный бухгалтер — Пашкель Т. В.

# ФОРМУЛА НОВАЙ УКРАІНСКАЙ ШКОЛЫ

## Уменне думаць, аналізаваць і выказваць уласнае меркаванне

**Рэформа, якая на дзесяцігоддзі вызначыць адукацыйны ландшафт краіны, распачалася ва Украіне. Больш за тры гады доўжыўся публічны дыялог аб стратэгіі змяненняў у адукацыі. Дзясяткі дыскусій адбыліся на пляцоўцы парламенцкага камітэта па пытаннях навукі і адукацыі і ў Міністэрстве адукацыі і навукі Украіны. Адкрытасць была беспрэцэдэнтная. Да абмеркавання далучыліся прадстаўнікі ўсіх зацікаўленых груп — педагогі, бацькі, работадаўцы, палітычныя сілы і органы ўлады, незалежныя эксперты, міжнародныя арганізацыі.**

**«Выпускнік украінскай школы не ўмее прымяняць атрыманыя веды ў жыцці. Ён як фаршыраваная рыба. Быццам бы і рыба, але не плавае», — вось так вобразна, але вельмі дакладна ахарактарызавалі сітуацыю ў адукацыі эксперты. Вынікам працяглага абмеркавання стаў закон «Аб адукацыі», прыняты ў канцы верасня мінулага года.**

**Пра тое, якія ж змяненні чакаюць украінскую школу, мы гутарым з загадчыцай кафедры методыкі навучання мовам і літаратуры Харкаўскай акадэміі неперарыўнай адукацыі, кандыдатам педагагічных навук, медыяпедагогам Галінай ДЗЕГЦЯРОВАЙ.**



### Ключавыя кампетэнцыі

— Давайце азірнёмся назад, — адразу прапанавала наша суразмоўніца. — Якім быў тэлефон сто гадоў таму і які функцыянал маюць смартфоны сёння? Якімі былі аўтамабілі і што мы сёння бачым на нашых вуліцах? А якім быў школьны клас стагоддзе таму? Ці моцна ён змяніўся? Тыя ж роўныя шэрагі з партаў, узнятыя вучнямі рукі, і ў цэнтры ўсяго дзейства знаходзіцца настаўнік — ён у класе галоўны.

Канцэпцыя новай украінскай школы з'явілася не на пустым месцы. Былі людзі, якім не ўсё роўна. Яны вывучылі еўрапейскі вопыт, узялі найлепшыя практыкі і паспрабавалі іх адаптаваць з улікам нашага менталітэту. Галоўнае — існавала разуменне, што цяперашнюю сістэму адукацыі трэба змяняць, прычым разуменне было як з боку простых настаўнікаў, так і з боку кіраўніцтва сістэмы адукацыі. Міністр адукацыі і навукі Украіны Лілія Грыневіч спасылалася на наступныя лічбы: праведзеныя даследаванні грамадскай думкі паказалі, што змяненняў менавіта ў сярэдняй адукацыі чакалі 76 % украінцаў, а станам цяперашняй школы былі задаволены толькі 10 % бацькоў і 15 % настаўнікаў.

У аснову ўсіх змяненняў ва ўкраінскай школе быў пакладзены кампетэнтнасны падыход. Усяго было выдзелена 10 ключавых кампетэнцый, здольных забяспечыць жыццёвы поспех моладзі ў грамадстве ведаў. Сярод іх уменне гаварыць і выказваць думкі на дзяржаўнай і роднай мове, валоданне замежнымі мовамі, матэматычная адукаванасць, якую можна прымяняць не толькі на ўроках матэматыкі, але і ў жыцці, кампетэнцыі ў прыродазнаўчых навуках і тэхналогіях, інфармацыйна-лічбавая кампетэнцыя, уменне вучыцца на працягу жыцця, агульнакультурная адукаванасць, экалагічная адукаванасць і здаровы лад жыцця; прадпрымальнасць, сацыяльная і грамадзянская кампетэнцыі. Усе пералічаныя кампетэнцыі аднолькава важныя і ўзаемазвязаныя. І кожную з іх вучні будуць набываць паслядоўна, пры вывучэнні розных прадметаў на ўсіх этапах адукацыі. Для прыкладу інфармацыйна-лічбавая кампетэнцыя — вельмі шырокае паняцце, якое ўключае не толькі ўпэўненае і адначасова крытычнае прымяненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, але і інфармацыйную і медыяадукаванасць, работу з базамі даных, навыкі бяспекі ў інтэрнэце і кібербяспекі, разуменне этыкі работы з інфармацыяй. **Агульнымі ж для ўсіх кампетэнцый з'яўляюцца такія ўменні, як крытычнае мысленне, здольнасць лагічна абгрунтоўваць сваю пазіцыю, ініцыятыўнасць, творчасць, уменне вырашаць праблемы, ацэньваць рызыкі і прымаць рашэнні, здольнасць да супрацоўніцтва ў камандзе.** Як кажуць, можна чытаць на хуткасць, а можна — з разуменнем. Школа кампетэнцый — гэта чытанне з разуменнем.

### Дыялог, а не маналог

Адзін з ключавых момантаў у рэформе школы — змяненне ролі настаўніка з аўтарытарнай на партнёрскую і арыентацыя на патрэбы вучняў. Пры аўтарытарнай педагогіцы настаўнік заўсёды мае рацыю. А вучань, які задае пытанні, — як правіла, нязручны вучань. Новая ж украінская школа якраз накіравана на тое, каб вучань думаў і задаваў пытанні. Педагогіка партнёрства — гэта дыялог, роўнасць бакоў, павага да асобы, добразычлівасць і пазітыўнае стаўленне, давер у адносінах. У яе рамках будуць выкарыстоўвацца метады выкладання, заснаваныя на супрацоўніцтве (гульні, праекты, эксперыменты, групавыя заданні і г. д.). Настаўнік павінен не проста весці ўрок, а рэалізоўваць мэты ўрока разам са сваімі вучнямі. Да таго ж школа партнёрства мае на ўвазе больш глыбокую ўцягнутасць сям'і ў пабудову адукацыйнай траекторыі дзіцяці.

***— Украіна ў гэтым годзе, як, дарэчы, і Беларусь, упершыню будзе ўдзельнічаць у міжнародным даследаванні адукацыйных дасягненняў навучэнцаў PISA. Ці хваляюецеся вы за вынікі?***

